



Сцэны са спектакля "Ціха тут на досвітках"

# З павагай да свайго

**У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы 4 снежня прайшло пасяджэнне Савета па культуры пры Міністэрстве культуры. Мерапрыемства было прысвечанае патрыятычнай тэматыцы ў сучасным мастацтве.**



Падчас пасяджэння

Пасяджэнню Савета па культуры папярэднічалі прагляд спектакля студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў "Ціха тут на досвітках" і выстава намінантаў ды пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на найлепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі. Удзел у пасяджэнні ўзялі кіраўнікі дзяржаўных органаў, сталічных і абласных устаноў ды арганізацый культуры і адукацыі, а таксама прадстаўнікі творчых саюзаў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў і кінематаграфістаў.

## ЗАХАВАЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ

Як адзначыў міністр **Анатолій Маркевіч**, тэма патрыятызму з'яўляецца надзвычай актуальнай для сучаснага грамадства.

— У любой сітуацыі першаснымі робяцца менавіта тыя пачуцці, якія дазваляюць разумець прыналежнасць да краіны, дзе ты жывеш, і да тых працэсаў, якія там адбываюцца. Існуе меркаванне, што ад аднаго чалавека нічога не залежыць, але гэта абсалютна няправільнае мысленне, бо кожны чалавек робіць свой унёсак у агульны здабытак нашай краіны, і ні ў якім разе нельга быць староннім назіральнікам. Калі мы выхоўваем сапраўдных патрыётаў, то шматлікія пытанні адпадаюць самі сабой, бо такі чалавек перадусім думае аб тым, што ён зрабіў для сваёй радзімы. На патрыётах трымаецца краіна, і нават калі з'яўляецца складаная сітуацыя, пачуццё патрыятызму дазваляе захаваць нашы суверэнітэт і незалежнасць. Самае галоўнае — любіць радзіму не на словах, а на справе, даводзіць гэта сваімі ўчынкамі ва ўсіх напрамках і праявах сучаснага жыцця. Вучань, які старанна вучыцца і выконвае сваю работу, студэнт, які авалодвае прафесіяй, рабочы ля станка, які вырабляе вельмі важную прадукцыю, начальнік, які пераймаецца развіццём свайго прадпрыемства, або юнак, які служыць ва Узброеных Сілах, — кожны з'яўляецца патрыётам сваёй краіны, бо думае аб яе будучыні.

Міністр таксама дадаў, што сфера культуры з'яўляецца флагманам патрыятычнага выхавання, бо праз спектаклі, канцэрты, выставы спрабуе паказаць актуальныя тэмы, якія цікавяць грамадства і даюць магчымасць зарыентавацца ў няпростай сістэме каардынат. Як падкрэсліў Анатолій Маркевіч, цяпер мы асабліва востра ўсведамляем неабходнасць захавання традыцыйных каштоўнасцей дзяржавы, фарміравання ідэалаў, поглядаў і перакананняў грамадзян, іх разумення нашага гістарычнага шляху. А патрыётамі так проста не робяцца, і тут на варце стаіць культура. Калі мы аб'яднаем намаганні, то і спектаклі, і канцэрты, і фестывалі, і лекцыі будуць садзейнічаць не толькі асвеце і патрыятычнаму выхаванню дарослага і маладога пакалення, але і іх удзелу як актыўных стваральнікаў.

## ПАДТРЫМКА ПАТРЫЁТАМ

Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Кацярына Усава** адзначыла, што ў 2021—2022 гадах пры падтрымцы гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь рэалізавана шэсць праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. У 2023-м грантавую падтрымку атрымалі пяць культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі: спектакль Брэсцкага тэатра лялек "Еўфрасіння Полацкая. Святыя літары", праект "Лінія памяці. Код вайны" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, выставачны фотадакументальны праект "Скрадзенае дзяцінства" Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, выставачны праект "Вобраз радзімы ў творчасці беларускіх мастакоў XVIII—XII стагоддзяў" Нацыянальнага мастацкага музея і спектакль "Двор майго дзяцінства" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **Наталля Карчэўская** распавяла аб досведзе падрыхтоўкі новага пакалення творчых работнікаў шляхам іх удзелу ў рэалізацыі культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі, у тым ліку праз стварэнне музычна-харэаграфічных пастановак, відэапраектаў, арт-аб'ектаў у гарадскім асяроддзі і 3D-мадэляў помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Між іншага прагучалі прапановы аб увядзенні практыкі заказу студэнцкіх дыпломных праектаў арганізацыямі культуры, а таксама аб увядзенні намінацыі "Дэбют" у рамках нацыянальных прэмій у сферы культуры.







З выставы праектаў патрыятычнай тэматыкі

## НІХТО, АКРАМЯ НАС

Генеральны дырэктар Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы **Ганна Сенькавец** падзялілася досведам і праблемамі фарміравання сучаснага патрыятычнага рэпертуару, а дырэктар Цэнтра па падтрымцы літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі **Анатолій Матвіенка** паразважаў над пытаннем стварэння п'ес і лібрэта для пастановак спектакляў патрыятычнай тэматыкі. Звяртаючы ўвагу на рэпертуарную палітыку беларускіх тэатраў, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы **Ігар Марзалюк** падкрэсліў, што перадусім варта звяртацца да твораў айчынных аўтараў, якія раскрываюць патрыятычную тэматыку, непарыўна звязаную з нацыянальнай традыцыяй. Акрамя таго, ён звярнуў увагу на неабходнасць стварэння якасных анімацыйных фільмаў на гістарычную тэматыку, адпаведных узроставым асаблівасцям дзіцячай і падлеткавай аўдыторыі.

**Уладзімір Рылатка**, колішні першы намеснік міністра культуры, таксама звярнуў увагу на неабходнасць абараняць на сцэне месца і ролю беларускай мовы і айчынных аўтараў, бо ніхто ў свеце, акрамя нас, гэтага не зробіць.

Падсумоўваючы дыялог аб патрыятызме ў мастацтве, Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што ў гэтай сферы нельга задавольвацца самаправаздачамі і самазаспакаеннем, таму размова на дадзеную тэму яшчэ будзе працягнутая і мусіць заўжды заставацца ў цэнтры ўвагі.

**Антон РУДАК**

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА
і з Тэлеграм-канала Міністэрства культуры